# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

31 мая
2017 г.
№19 (403)




стар. 2

**Напоўніць зместам новую форму**



стар. 5

**Лёс адной школы**



стар. 8

**Там, дзе раслі старыя таполі...**

ТЭМА ТЫДНЯ

# АПТЫМІЗАЦЫЯ Ў ІНТАРЭСАХ ВУЧНЯЎ

## Закрыць нельга пакінуць. Варыянты магчымыя



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Закрыццё ў вёсках малакамплектных школ заўсёды праходзіць надзвычай балюча, прычым як для саміх дзяцей і іх бацькоў, так і для школьных педагогаў. Усё ж такі сельская школа застаецца адукацыйным і культурным цэнтрам жыцця вяскоўцаў. І сам факт яе закрыцця ставіць пад пытанне перспектывы далейшага існавання населенага пункта...**

### Міфы пра індывідуальны падыход

Дзесяць вучняў у класе — гэта многа ці мала? А калі ў класе навучаюцца ўсяго два—тры ці пяць дзяцей? І колькі ўвогуле вучняў павінна быць у 10-х і 11-х класах, каб старшую ступень школы можна было захаваць? Адназначнага адказу на гэтыя пытанні не можа быць, бо ў кожнага зацікаўленага боку — свая праўда. На думку бацькоў школьнікаў, малая напаўняльнасць класа — гэта, хутчэй, вялікі плюс, бо, калі ўсе дзеці ў педагога навідавоку, можна спадзявацца на індывідуальны падыход. Да таго ж у малакамплектнай школе звычайна пануе амаль «сямейная атмасфера». І за падвоз дзяцей у суседнюю вёску не трэба хвалявацца...

стар. 4

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# КАВАРНЫЯ НІТРАТЫ

## Якасць пітной вады ў вясковых калодзежах выклікае заклапочанасць

**Ёсць такое меркаванне, што вада з калодзежа самая смачная і чыстая. Да названага стэрэатыпа прыклалі руку нават пісьменнікі і паэты. Шмат прыгожых слоў было сказана пра сцюдзёную калодзежную ваду. Яна, вядома, таго вартая. Тым больш што ў былыя часы калодзеж быў адзінай крыніцай пітной вады ў сельскай мясцовасці. Зараз многае памянялася.**

### Маніторынг

Санітарныя ўрачы па ўсёй краіне б'юць трывогу. Надта часта ў пробах вады выяўляюцца нітраты. У пагоні за высокай рэнтабельнасцю сельгаспрадпрыемствы ўносяць пад пасевы тоны мінеральных угнаенняў. Дождж змывае з палёў названыя рэчывы, яны трапляюць у рэкі і азёры, у падземныя воды. Такім чынам нітраты лёгка аказваюцца ў калодзежах. Усё сказанае характэрна і для аднаго з самых маленькіх раёнаў краіны — Жабінкаўскага. Тут 40 працэнтаў вясковага насельніцтва ўжывае ваду неводаправоднага паходжання.

З **галоўным дзяржаўным санітарным урачом раёна Надзеяй ШОСЦІК** праглядаем справаздачы аб выніках маніторынгу вады ў вёсках. Цікава, што нават на суседніх падворках карціна можа кардынальна адрознівацца. У аднаго вяскоўца вада цалкам чыстая, у другога — з нітратамі, а то і з бактэрыямі. Таму нельга сказаць, што той ці іншы населены пункт



мае прыгодную да ўжывання пітную ваду, а іншы — наадварот.

— Многае залежыць ад выканання правілаў пры будаўніцтве калодзежа, — расказвае Надзея Шосцік. — Шэраг калодзежаў выкапаны даволі даўно бацькамі альбо дзядамі цяперашніх гаспадароў домаўладанняў. Некаторыя не паклапаціліся, каб захаваць патрэбную адлегласць ад хлявоў, не ўлічвалі ўхіл — калодзеж не павінен размяшчацца ніжэй за гаспадарчыя пабудовы — не адступілі далёка ад выграбной ямы. І самае галоўнае, перш чым пакласці калодзежныя колцы-трубы, неабходна абсталяваць так званы гліняны замок. Слой гліны патрэбны, каб не прапускаць у калодзеж шкодныя рэчывы. Калі гэтыя патрабаванні парушаны, можна чакаць адмоўных вынікаў даследавання.

стар. 3